# ВЫЦІНАНКІ МОГУЦЬ СТАЦЬ СПАДЧЫНАЙ ЮНЕСКА

## А ў касцёле ў Нясвіжы і Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку завершацца рэстаўрацыйныя работы

**Пытанні, звязаныя з аховай гісторыка-культурнай спадчыны, на нядаўна праведзеней выніковай калегіі Міністэрства культуры агучыў намеснік міністра Сяргей Саракач. Ён заўважыў, што з 1 студзеня 2023 года ўступіў у дзеянне абноўлены Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Па ініцыятыве Міністэрства культуры ўнесены змяненні ў Падатковы кодэкс, з'явіліся новыя правілы ў галіне заканадаўства аб распараджэнні маёмасцю.**

Адзін з вынікаў таго — актывізацыя работы па ўключэнні аб'ектаў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Летась ён папоўніўся 24 новымі аб'ектамі. Шпарчэй ідзе работа па стварэнні пашпартоў на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Павялічыўся і тэмп па зацвярджэнні праектаў зон аховы на аб'ектах спадчыны. Шмат зроблена для ўключэння ў гаспадарчы і турыстычны абарот аб'ектаў, якія раней не выкарыстоўваліся.

Вырасла колькасць аб'ектаў, на якіх здзяйсняліся праектныя работы, у параўнанні з 2022 годам у 2,4 раза. Аб'ём рамонтна-рэстаўрацыйных работ павялічыўся на 13 працэнтаў. Дзякуючы новаўвядзенням у заканадаўстве, распрацавана пяць пашпартоў руінiраваных аб'ектаў. За два гады ўдалося дадаць у гаспадарчы і турыстычны абарот 37 помнікаў архітэктуры. Яскравыя таму прыклады: палацава-паркавы ансамбль у вёсцы Свяцк, капліца ў вёсцы Дубой, вялікая Любавіцкая сінагога ў Віцебску. Турыстычныя маршруты папоўніла капліца-ўсыпальніца аграгарадка Заказель.

У сакавіку мінулага года накіраваны ў ЮНЕСКА новыя беларускія намінацыі — беларускае мастацтва выцінанкі і неглюбская тэкстыльная традыцыя, абарона якіх запланавана ў 2024 і 2026 гадах. У верасні і снежні мінулага года без заўваг камітэта ЮНЕСКА здадзена справаздача па шасці аб'ектах спадчыны Беларусі. На 2024 год запланавана ўнясенне ў ЮНЕСКА дасье па элеменце «культура беларускай дуды».

У 2023 годзе былі працягнуты рамонтныя, рэстаўрацыйныя і будаўнічыя работы на помніках архітэктуры, а таксама аб'ектах, якія маюць ахоўны статус. Сярод іх — палацава-паркавы ансамбль у вёсцы Жылічы. Летась тут завершаны работы па абсталяванні палаца пажарнай сігналізацыяй, выканана добраўпарадкаванне, пасаджаны расліны ў аранжарэі. Па аб'екце плануецца далейшае правядзенне рамонтна-рэстаўрацыйных работ, завяршаецца распрацоўка праектнай дакументацыі па аднаўленні водна-паркавай сістэмы.

Былі прыняты меры па аднаўленні абарончай сцяны заходняга бастыёна палацава-паркавага ансамбля ў Нясвіжы. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы, рамонтна-рэстаўрацыйныя работы на якім вядуцца з 2011 года. Летась былі адноўлены інжынерныя сеткі, добраўпарадкавана тэрыторыя, зроблена рэканструкцыя з рэстаўрацыяй званіцы.

Працягнуцца работы на палацавым комплексе ў гарадскім пасёлку Ружаны, на Крэўскім, Гальшанскім і Навагрудскім замках. Аднаўленне і рэстаўрацыя гэтых аб'ектаў нацыянальнага значэння садзейнічае папулярызацыі гістарычнай спадчыны сярод насельніцтва і павелічэнню турыстычных патокаў. Работы на Навагрудскім замку пачаліся ў 2012 годзе. На гэты год запланавана рэстаўрацыя вежы з прыстасаваннем пад пастаянную музейную экспазіцыю.

У бягучым годзе плануецца завяршыць работы па ўнікальным храме XII стагоддзя — Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку. Шмат зроблена для захавання гістарычных архітэктурных, канструктыўных і мастацкіх элементаў храма. Дарэчы, рэстаўрацыя фрэскавага роспісу тут пачалася яшчэ ў 1991 годзе.

# ПА СТАРОНКАХ «ДРЫГВЫ»

**«Чаго варты стары Талаш?» — так называецца выстаўка, якая адкрылася ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Часовая экспазіцыя сапраўды дапамагае больш даведацца пра знакамітага ўдзельніка савецка-польскай вайны, кіраўніка партызанскага атрада, узначаліў які ён ажно ў 78-гадовым узросце.**



Часовая экспазіцыя прысвечана адразу дзвюм датам — 90-годдзю з выхаду ў свет першага выдання аповесці «Дрыгва» і 180-годдзю з дня нараджэння чалавека, які стаў прататыпам галоўнага героя — Васіля Талаша. Тут можна пабачыць экспанаты з фондаў музея, фотазону. Таксама да выставачнага праекта падключыўся дом-музей Дзеда Талаша, які прадставіў фатаграфіі сям'і легендарнага дзеда (у якога, дарэчы, было 13 дзяцей) і кадры, на якіх Талаш сустракаецца з Якубам Коласам.



Фота Алены ДЗЯДЗЮЛІ.

Экспанаты да выстаўкі прадставіў і музей-майстэрня Заіра Азгура. Як падзяліўся яго **дырэктар Дзмітрый МІХЕЕЎ**, такія экспанаты надзвычай рэдка вывозяцца з майстэрні. Справа ў тым, што 95 працэнтаў скульптурных кампазіцый, якія захоўваюцца ў мемарыяльным музеі-майстэрні, зроблены з гіпсу, а матэрыял гэты вельмі далікатны, трэба быць надзвычай асцярожнымі пры яго транспарціроўцы, каб не пашкодзіць. Але выстаўка ў літаратурным музеі — якраз той выпадак, калі было зроблена выключэнне.

— Нельга забывацца, якое сяброўства было паміж Якубам Коласам і Заірам Азгурам, можна лічыць, што гэты праект дапамагае па-новаму пераасэнсаваць, якімі моцнымі былі сувязі паміж дзеячамі культуры, — заўважыў Дзмітрый Міхееў.

У адкрыцці выставы ўзялі ўдзел прадстаўнікі ваенна-гістарычнага клуба «Нашчадкі», адзетыя ў форму, што насілі салдаты Чырвонай Арміі ў тыя часы, калі партызаніў Дзед Талаш.

Экспанаты на часовай экспазіцыі суправаджаюць QR-коды. Пры спасылцы на іх дзякуючы сучасным прыстасаванням наведвальнікі могуць пачуць, быццам да іх звяртаюцца Якуб Колас, Заір Азгур і Дзед Талаш.

Як паведаміў **кіраўнік выставачнага праекта Іван ДУБОВІК**, аповесць «Дрыгва» была перакладзена на 13 моў. Цікава было б даведацца, якая рэакцыя ўзнікла на твор, калі ён стаў даступным для кітайскіх чытачоў. Напрыклад, вядома, што перакладзены на кітайскую мову югаслаўскі фільм пра партызан у свой час вельмі зачапіў мясцовую публіку: імёны герояў стужкі давалі дзецям, маркам піва. Прадстаўленыя ў экспазіцыі пераклады «Дрыгвы» ўсё ж дапамагаюць крыху даведацца пра тое, як замежныя перакладчыкі і мастакі, якія афармлялі кнігі, успрымалі героя аповесці. Калі прыглядзецца да вокладак кніг, можна заўважыць, што, напрыклад, у кітайскім перакладзе змешчаны малюнак галоўнага героя з выразна азіяцкімі рысамі твару, а вось з малдаўскага перакладу пазірае стары рамантычны цыган.

Таксама ў экспазіцыі можна пабачыць эскізы да оперы «У пушчах Палесся» Багатырова, зробленыя па аповесці «Дрыгва», і фота ўдзельнікаў пастаноўкі.

У мерапрыемстве ўзяў удзел і скульптар Максім Пятруль, які перадаў у фонды музея сваю работу, прысвечаную класіку беларускай літаратуры.

## Пазнай Беларусь

# РЭЛІГІЙНЫ ТУРЫЗМ — ШЛЯХ ДА ХРАМА?

**У Беларусі актыўна развіваецца рэлігійны турызм. Штогод тысячы паломнікаў наведваюць святыя месцы. Усё больш людзей падарожнічаюць па краіне, каб пазнаёміцца з архітэктурай, пакланіцца цудатворным абразам, трапіць на фестывалі і фэсты.**

«Сёння мы бачым патэнцыял каля 690 аб'ектаў рэлігійнага турызму. Прычым цікавасць разам з беларусамі праяўляюць замежныя грамадзяне, перш за ўсё жыхары Расійскай Федэрацыі», — заўважыў намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, кіраўнік рабочай групы па развіцці рэлігійнага турызму Міжведамаснага экспертна-каардынацыйнага савета па турызме пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Сяргей Герасіменя. Ён упэўнены, што сёння паломніцтвы і рэлігійны турызм спрыяюць выхаванню грамадзян праз веру і рэлігію. Таксама знаёмства з храмамі дазваляе адкрываць старонкі гісторыі нашай краіны. Вельмі актыўная патрыятычная работа вядзецца ў сталічным Храме-помніку Усіх Святых. Тут створаны музей, крыпта, праходзяць разнастайныя сустрэчы, круглыя сталы. За мінулы год Усіхсвяцкі храм наведала каля ста тысяч чалавек. Сярод самых папулярных аб'ектаў таксама — Свята-Елісавецінскі манастыр, манастыры ў Жыровічах і Полацку, касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Мінску.

Безумоўна, пры арганізацыі экскурсій у храмы трэба вырашаць шэраг пытанняў і праблем. Прынамсі, і арганізатарам, і экскурсантам варта наладжваць наведванне рэлігійных аб'ектаў такім чынам, каб, з аднаго боку, атрымаць патрэбную інфармацыю, з другога — не перашкаджаць вернікам, якія ў гэты час могуць знаходзіцца ў храмах. Як паведаміў прарэктар па вучэбнай рабоце інстытута тэалогіі Беларускага дзяржуніверсітэта Андрэй Гаранскі, па запыце Нацыянальнага агенцтва па турызме была падрыхтавана кніга з метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі і правядзенні рэлігійных экскурсій. Сёння на месцах як прадстаўнікамі канфесій, так і свецкімі ўстановамі вядзецца работа па збіранні матэрыялаў пра мясцовыя святыні, а гэта не толькі храмы, але і тое, што знаходзіцца ўнутры. Напрыклад, многія ведаюць пра цудатворныя абразы ў Жыровічах і Будславе, але шанаваныя святыні, да якіх звяртаюцца па дапамогу тысячы людзей, ёсць і ў іншых месцах. Плануецца стварыць папяровыя і электронныя рэсурсы, дзе такая інфармацыя будзе актуалізавана.

Кіраўнік Сінаідальнага аддзела па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Павел Сярдзюк звярнуў увагу, што часам у храме людзі знаходзяць адказы на галоўнае пытанне аб прызначэнні жыцця чалавека. Знаёмства з гісторыяй храма дапамагае ўсвядоміць сябе як прадстаўніка нацыі з багатымі тысячагадовымі традыцыямі і глыбокай верай. Нават убранне храма ўзвышае чалавека. Часам рэлігійны турызм, экскурсіі дапамагаюць людзям знайсці шлях да веры.



Супрацоўнік Сінаідальнага паломніцкага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы Наталля Закрэўская заўважыла, што сёння ў Беларусі працуе 35 манастыроў. Развіццё рэлігійнага турызму магчыма дзякуючы таму, што храмы рэканструяваны, вяртаюцца святыні, святары ідуць на кантакты: з імі можна звязацца, узгадніць час, нават заказаць малебен для групы, якая наведае святыню. На базе Мінскага духоўнага вучылішча рыхтуюцца праваслаўныя экскурсаводы. Вельмі запатрабаваны рэлігійныя турызм у гасцей з Расійскай Федэрацыі. Групы прыязджаюць практычна на кожныя выхадныя. Іх уражвае архітэктура, многім цікава пабачыць каталіцкія храмы, напрыклад, храм у Гервятах, які называюць беларускім «Нотр-Дамам», пазнаёміцца з хрысціянскімі традыцыямі.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**